# Майстэрства — рэч эксклюзіўная



Раіса МАРЧУК,
фота Кастуся Дробава

**Выстаўка аднаго дня "Майстэрствам славім родны Полацк", прысвечаная прэзентацыі горада ў сувязі з яго юбілеем — 1150-годдзем з дня заснавання, — прайшла ў Доме дружбы Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі.**

Свае работы прадставілі майстры Полацкага Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур, якія былі створаны ў 1994 годзе. Намаганні супрацоўнікаў гэтай установы накіраваны на аднаўленне, развіццё і прапаганду народных беларускіх рамёстваў. І ў іх, відаць па ўсім, няблага атрымліваецца. Сведчаннем таму — выстаўка ў Мінску.

— Мэта нашага прыезду ў сталіцу — паказаць дасягненні полацкіх майстроў, — распавяла загадчык аддзела рамёстваў Полацкага Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур Наталля Чымірыкіна. — У Доме дружбы мы прадставілі разьбу па дрэве, лапікавае шыццё, вышыўку на ручніках і абрусах, роспіс па тканіне, вырабы з саломы і лазы, традыцыйныя скруткі-лялькі. Пры нашым цэнтры працуюць два цікавыя клубы. Першы аб'ядноўвае аматараў лапікавага шыцця і носіць сугучную назву "Рошва". Ім кіруе Ніна Ярмух. У Мінск мы прывезлі маляўнічыя коўдры з абрэзкаў. Гэта калектыўныя работы членаў "Рошвы".

А вось клуб "Роднасць" аб'ядноўвае майстроў, якія займаюцца рознымі відамі рамёстваў. З іх сем чалавек з'яўляюцца членамі Беларускага саюза майстроў народнай творчасці. На выстаўцы прадстаўлены работы рэзчыкаў па дрэве Мікалая Абраменкі і Валянціна Нагорнага, карункі Ядвігі Песінай і Ніны Кукуць, вырабы з лазы Аляксея Адамовіча, аплікацыя саломкай Ніны Фядулавай, лялькі Зінаіды Лёцінай, вельмі цікавая кераміка маладога майстра Алесі Пупкоўскай.

Сама Наталля Яўгенаўна працуе ў Цэнтры рамёстваў ужо дванаццаты год, завочна скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, аддзяленне "Народная творчасць. Народныя рамёствы". Спачатку яна навучылася вышываць, а потым пачала займацца роспісам па тканіне і, трэба сказаць, даволі паспяхова. Маляванкі майстра, якія таксама можна было ўбачыць на выстаўцы ў Мінску, прыцягнулі ўвагу многіх гасцей Дома дружбы.

Дарэчы, паралельна работы палачан дэманструюцца ў Віцебску, у абласным метадычным цэнтры, дзе праходзіць выстаўка "Каханне — гэта мы". У самім Цэнтры рамёстваў у дзвюх выставачных залах штомесяц мяняюцца экспазіцыі. Праводзяцца персанальныя і калектыўныя выстаўкі майстроў, мастакоў з Полацка і іншых мясцін.



Цяпер для майстроў клубаў "Рошва" і "Роднасць" наступіў адказны час. Іх калектывы павінны ў чарговы раз пацвердзіць ганаровае званне "народны".

— Рамёствамі сёння больш цікавяцца дарослыя, прыходзіць шмат пенсіянераў, вечарам збіраюцца тыя, хто працуе, — заначыла Наталля Чымірыкіна. — Асаблівай папулярнасцю карыстаюцца курсы шыцця з абрэзкаў тканіны. Для дзяцей мы праводзім майстар-класы, урокі беларускай культуры, запрашаем юных палачан на пасяджэнні ў гасцёўню. Працуем з хлопчыкамі і дзяўчынкамі пачынаючы з дзіцячага садка. Заўважылі, што ў апошні час цікавасць да народных рамёстваў вырасла, але сапраўднымі майстрамі становяцца адзінкі. На жаль, перадача майстэрства ад аднаго пакалення да другога ідзе складана. І хочацца зрабіць усё магчымае, каб традыцыйныя беларускія рамёствы не толькі захоўваліся, але і квітнелі.

***На здымках:** Наталля Чымірыкіна прэзентуе вырабы калег; пано-маляванка "Стары горад" — работа Наталлі Яўгенаўны.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ